6. McParland, R. Bestseller: A Century of America's Favorite Books / Robert McParland. – Rowman & Littlefield, 2018. – 336 p.
7. Saroyan, W. The Adventures of Wesley Jackson / William Saroyan. – New York: Harcourt, Brace and Company, 1946. – 285 p.
8. Saroyan, W. The Human Comedy / William Saroyan. – New York: Harcourt, Brace and Company, 1943. – 291 p.
9. Smith, J. Y. William Saroyan Is Dead At 72; Wrote 'The Time of Your Life' [Electronic resource] / J. Y. Smith // The New York Times. – May 19, 1981. – Mode of access: https://www.nytimes.com/1981/05/19/obituaries/william-saroyan-is-dead-at-72-wrote-the-time-of-your-life.html – Date of access: 18.04.2016.

**V. Hembitskaya**
Polotsk State University
e-mail: v.hembitskaya@pdu.by

**World War II As Depicted In the Novels by William Saroyan: Value-based Orientations**

*Key words: W. Saroyan, "The Human Comedy","The Adventures of Wesley Jackson", World War II, the motif of home.*

*The article dwells on World War II as depicted in the novels by the American writer William Saroyan. The author of the article emphasizes that W.Saroyan's novels belong to the bulk of anti-war literature, as the writer shows war to be a disaster that separates loving people from each other. Both the novel "The Human Comedy" and the novel "The Adventures of Wesley Jackson" are saturated with the motif of* the *significance of home and loving family.*

**Г.А. Гладкова**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: anngrin@mail.ru

УДК 821.162.1-311.6.09

## АДЛЮСТРАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДАЎ ЛІСОЎСКАГА Ў РАМАНЕ Ф.А. АСЯНДОЎСКАГА "LISOWCZYCY"

*Ключавыя словы: лісоўчыкі, "маскоўская Смута", Рэч Паспалітая, канфедэрацыя, этнічны стэрэатып.*

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць атрадаў Аляксандра Юзафа Лісоўскага (лісоўчыкаў) падчас "маскоўскай Смуты". Значная ўвага надаецца асобе палкоўніка Лісоўскага, якая ў рамане Ф.А. Асяндоўскага "Lisowczycy" атрымала своеасаблівую рамантычную мастацкую інтэрпрэтацыю.*

Фердынанд Антоні Асяндоўскі (F.A. Ossendowski, 1878–1945) з'яўляецца пісьменнікам, грунтоўнае асэнсаванне літаратурнай спадчыны якога дазволіць удакладніць характар інтэрпрэтацыі падзей розных перыядаў гісторыі ў мастацкай літаратуры. Ураджэнец Віцебскай губерні (м. Люцын) Асяндоўскі быў вядомым грамадскім дзеячам, вучоным-хімікам, вандроўнікам, які праявіў цікавасць да этнаграфіі, адлюстраваў у шэрагу прыгодніцкіх твораў асаблівасці побыту, веравызнання малых народаў Поўначы і Далёкага Усходу. Шматжанравая спадчына пісьменніка і вучонага (гістарычныя і прыгодніцкія раманы, навуковыя працы, нарысы, мемуары, артыкулы, нататкі і г.д.) напісана на рускай і польскай мовах.

Асаблівай увагі заслугоўвае шэраг гістарычных твораў Асяндоўскага, якія ўзнаўляюць розныя этапы польскай гісторыі ("Wańko z Lisowa" (1928), "Lisowczycy" (1929), "Trębacz cesarski" (1931) і інш.).

Гістарычны раман "Lisowczycy" (Парыж, 1928 г.) прысвечаны складанаму палітычнаму перыяду т.зв. "маскоўскай Смуты", падзеі пачынаюцца ў 1611 годзе, калі літвінскія і беларускія шляхцічы сабраліся ў Вільні на ваенную нараду. Вакол вялікага канцлера літоўскага Льва Сапегі згуртавалася шляхта з-пад Віцебска і Дынабурга, якую ўзначалілі Ксаверы Ліс і Ян Гарабурда. Агульнае рашэнне сходу: падтрымаць палкоўніка Аляксандра Лісоўскага (кольцасцю 2000 шабель) і далучыцца да яго атрадаў.

Аляксандр Юзаф Лісоўскі гербу Еж (1580 (?) – 1616) паходзіў з вядомага літвінскага шляхецкага роду. Асоба палкоўніка атрымала розныя, часам супрацьлеглыя ацэнкі сучаснікаў і нашчадкаў. З аднаго боку, нават непрыяцель паважаў лісоўчыкаў за высокія баявыя якасці, маланкавасць стратэгіі, нечаканасць нападу, неверагодную для таго часу мабільнасць, смеласць і рашучасць у бітвах. З другога – атрады Лісоўскага былі небяспечнымі для мірнага насельніцтва не толькі Маскоўскай дзяржавы, але і Вялікага княства Літоўскага.

Аналізуючы ўлёткі XVII ст., В. Еўмянькоў спыніўся на асобе А.Лісоўскага, адносна якога зазначыў, што "больш легендарнай і адначасова таямнічай асобы цяжка адшукаць нават у першай палове сармацкага, багатага на герояў і авантурыстаў XVII ст." [1, с. 93]. Даследчык падаў сціслае апісанне вайсковых заслуг палкоўніка, падсумаваўшы аповед высновай: "За 40 з невялікім гадоў



Репозиторий ВГУ

жыцця Юзаф Аляксандр Лісоўскі прайшоў шлях ад “баніты” да прывітанага і ўганараванага на сойме героя” [1, с. 93].

Сваё бачанне асобы і дзейнасці Лісоўскага падаў расійскі гісторык і археолаг А.Зорын. Аўтар падрабязна даследаваў паходжанне, жыццёвы і ваенны шлях героя, часта палемізаваў з меркаваннямі іншых айчынных і замежных гісторыкаў [2]. Дарэчы, назвы раздзелаў кнігі (“Змій-лютар…”, “Бунтаўшчык”, “Авантурыст”, “Карацель” і інш.) сведчаць пра часам адмоўнае, нават дэманічнае ўспрыманне асобы Лісоўскага, які ўяўляецца “антыгероем” Смуты.

Згодна з традыцыяй польскай літаратуры ў аналізуемым гістарычным рамане Ф. Асяндоўскага асоба Лісоўскага набывае рысы адважнага і непераможнага змагара, які ўславіў польскую зброю, палкаводца, які цярпеў паразу ў вялікіх баталіях, але аднаўляўся пасля іх. Лісоўчыкі паказаны як атрад няўлоўных герояў-пераможцаў, які трымаў у пастраху расійскія землі “да Белага мора, Волгі і Урала”.

Партрэтная характарыстыка Лісоўскага створана ў адпаведнасці з рыцарскай традыцыяй (“Pan Chodkiewicz swój wzrok przenikliwy zatrzymał na chudej, marsowej, ogorzałej twarzy pułkownika, na jego stalowych, zimnych oczach, na ustach zaciętych, na krótko przystrzyżonych wąsach i gładko ogolonej głowie. Czarna, przydługa czamara, mocno zaciągnięta skórzanym pasem z wiszącą na nim krzywą, ciężką szablą, oblegała szeroką pierś i wąskie biodra rycerza” [4, с. 28]), яна ўтрымлівае параўнанні героя з магутным чорным драпежным арлом, ваўком і інш. У тэксце чытаем: “Lisowski za głowę się porwał i zawył. Zdawało się, że to wilk zgłodniały w noc zimową wyje rozpaczliwie” [4, с. 82]. Партрэтныя дэталі таксама працуюць на адпаведныя асацыяцыі параўнання чалавека і дзікага звера: “głowa drapeżna”, “szeroka pierś”, “wąskie biodra” і інш.

Характару Лісоўскага ўласцівыя настойлівасць і прага да дзеяння, ваяр лічыць чаканне памылкай, ён гатовы адзін ісці на Маскву і ўласнымі сіламі здабыць перамогу. Як паведамляе пісьменнік, войска Аляксандра налічвала чатыры харугві (чорную, чырвоную, зялёную і блакітную), да атрадаў далучалася шляхта з розных куткоў літвінскага і беларускага краю, былі тут і данскія казакі, чыю аўтэнтычную гаворку аўтар падае ў творы.

Эпізод сустрэчы Лісоўскага з каралём Рэчы Паспалітай Зымундам ІІІ дазваляе заўважыць у характары героя пачуццё ўласнага гонару, здольнасць мець самастойнае меркаванне і смела адстойваць яго перад першай асобай дзяржавы. Невыпадкова шляхта, маючы на ўвазе вострае слова кіраўніка лісоўчыкаў, так яго характарызуе: “Herbu Jeż i sam – istny jeż” [4, с. 61].

Погляд палкоўніка на палітыку Масковіі падаецца праз характарыстыку сістэмы кіравання ў суседняй дзяржаве. У размове з гетманам Хадкевічам Лісоўскі сцвярджае, што дэспатызм – гэта неабходнасць для рускага народа: “Najokrutniejszych, najkrwawszych tam wielkimi nazywać zwyczajni są” [4, с. 80]. Заўважым, што гэты пункт погляду дастаткова традыцыйны для польскага ўяўлення пра ўсходняга суседа: такі этнічны стэрэатып быў абумоўлены шляхецкай дэмакратыяй Рэчы Паспалітай і дзяржаўна-манархічнай уладай Маскоўскай дзяржавы.

Гаворка героя насычана эмацыянальнасцю, сустракаюцца ў выказваннях выразы на латыні і трапныя народныя выслоўі. У тым жа дыялогу ў адказ гетману Лісоўскі перайначыў вядомае народнае выслоўе “Nie było nas – był las; nie będzie nas, będzie las” на наступнае: “Gdy mnie nie było, był las, lecz, gdy ja z wojskiem przez las przejdę, tam on już nigdy nie powstanie!” [4, с. 81], што дэманструе ўпэўненасць героя ва ўласных сілах і дзейнасці атрада.

Падкрэсліваючы ролю лісоўчыкаў у тагачасных палітычных падзеях, Ф.Асяндоўскі адзначае, што гетман уласнай лёгкай кавалерыі быў у той неспакойны час увасабленнем рыцарства і адвагі. Гэта многіх гарнула да Лісоўскага. Шляхта крэсаў ганарылася тым, што менавіта з яе асяроддзя выйшаў такі герой.

З біяграфіі Аляксандра Лісоўскага вядома, што ён раптоўна памёр 1 кастрычніка 1616 г. перад чарговым маскоўскім паходам (“Лисовской же пойде в Московское государство, похваляся” [2, с. 180]). Прычына смерці засталася невядомай: палкоўнік нечакана зваліўся з каня пры аб’ездзе войска і імгненна сканаў. Хадзілі чуткі, што Лісоўскі мог быць атручаны мясцовымі жыхарамі ці расійскімі агентамі. Такая версія згаданая і ў рамане. Адзін з герояў даведваецца, што маскалі падаслалі да Лісоўскага таемных забойцаў. Аднак на гэтым пісьменнік спыняецца, і больш паведамленняў пра лёс палкоўніка не сустракаецца.

Далейшы аповед будзе датычыць дзейнасці лісоўчыкаў. Пад новым кіраваннем полк працягне ваенныя рэйды па рускіх землях. Як вядома з гістарычных крыніц, у 1617 годзе атрад лісоўчыкаў налічваў дзесяць харугвей па сто чалавек кожная. Хадзілі чуткі, што яны дасягнулі Ледавітага акіяна і Сібіры. Адзін з сучаснікаў, Яраш Клечкоўскі, пакінуў успаміны, дзе ёсць такая інфармацыя [3]. Дарэчы, менавіта атрад Клечкоўскага, як паведамляе аўтар, дасягнуў Сібіры, дзе зноў перакрыжаваўся лёс галоўнага героя рамана Марціна Ліса і лісоўчыкаў.

Як паведамляе аўтар, людзі Лісоўскага дасягалі Поўначы і Урала. Так, атрад, у якім быў сотнікам Марцін Ліс, не толькі вызваляў з рускіх крэпасцей палонных (напрыклад, з Абдорскага астрогу на рацэ

Рэпазіторый ВДУ

Об), але і ўступаў ва ўзаемадзеянне з мясцовымі плямёнамі (вагуламі, самаедамі, калмыкамі і інш.), якія вырашылі, карыстаючыся Смутай, зрабіць Сібір незалежнай. Такім чынам, адзін з атрадаў Лісоўскага застаўся ў глыбі таёжнага краю, адрэзаны ад радзімы "помслівай варожай Руссю".

У рамане сустракаюцца каштоўныя прыродаапісальныя адступленні, напрыклад, Асяндоўскі паведамляе пра Паўночнае ззянне, жывёльны і раслінны свет Поўначы, традыцыі мясцовага насельніцтва, асаблівасці палявання і выжывання ў суровым краі. Лісоўчыкі ва ўмовах працяглай паўночнай зімы сумуюць па сонцы і цеплыні, хварэюць на небяспечны скарбут, які становіцца прычынай заўчаснай смерці многіх лісоўчыкаў, непрызвычаеных для такіх умоў жыцця. Як паведамляе аўтар, памерлых закапвалі ў снег, дзе яны станавіліся хуткай здабычай ваўкоў.

Пяць гадоў давядзецца правесці ў паўночным краі харугві лісоўчыкаў, якая складалася з трыццаці палякаў, пяцідзесяці данскіх казакаў і дваццаці чалавек іншых народаў. Знаходзячыся на службе ў вядомага сібірскага землеўладальніка Міхала Строганава, лісоўчыкі на чале з Марцінам Лісам ваююць з мясцовымі плямёнамі, здабываюць у іх звесткі пра каштоўныя мінералы. Як паведамляе аўтар, імя Ліса наводзіла страх на мясцовых жыхароў, дзе ён з'яўляўся, усюды яго сустракалі з багатымі дарамі, "датыкаліся чолам яго стрэмені" і паказвалі землі, дзе ёсць золата, каштоўныя камяні, медзь, олава і жалеза. Незлічоныя скарбы сабраў сібірскі прамысловец рукамі і шабляй польскага рыцара. Строганаў параўноўвае палякаў з Ермаком, які лічыцца легендарным героем за сваю перамогу над ханам Кучумам і заваяванне Сібіры для рускай дзяржавы.

Тапанімічная прастора, звязаная з дзейнасцю лісоўчыкаў, ахоплівае неабсяжную тэрыторыю ад рэк Кары, Пячоры і Ледавітага акіяна да Каспійскага мора. Прыгоды герояў на чужыне будуць завершаныя толькі ў 1619 годзе пасля Дэўлінскага перамір'я. Марцін Ліс вернецца на Віцебшчыну да бацькоў, аправіцца ад былых ран і зноў будзе рыхтавацца да вайны (на гэты раз з Асманскай імперыяй).

У тэксце рамана часта знаходзім спасылкі аўтара на працы па гісторыі, мемуары сучаснікаў падзей, іншыя дакументальныя крыніцы. Напрыклад, пісьменнік прыгадвае работу Маўрыцыя Дзедушыцкага, які пісаў пра дзейнасць лісоўчыкаў, Іосіфа Трацяка і яго "Гісторыю Хоцімскай вайны" і інш. Ф.А. Асяндоўскі захаваў фактычную дакладнасць падзей, стварыў у рамане атмасферу, максімальна набліжаную да рэалій эпохі, з дапамогай розных прыёмаў (маўленне герояў, партрэтныя характарыстыкі, рэчыўна-побытавыя дэталі, адступленні этнаграфічнага характару і г.д.) атрымалася ўдалай пісьменніцкая спроба рэканструкцыі падзей "маскоўскай Смуты". Аўтарскаму стылю характэрна рамантызацыя вобразаў галоўных герояў, пісьменніка цікавіць характар чалавека ў экстрэмальных умовах, яго героі праходзяць праз выпрабаванні, загартоўваючы сілу духа і не губляючы гонару.

Дзейнасць лісоўчыкаў атрымала featuredрознабаковыя ацэнкі ў гісторыі і літаратуры, аднак для Ф.А. Асяндоўскага яны былі героямі, народжанымі складанымі палітычнымі ўмовамі XVII стагоддзя, лёгкай кавалерыяй з суровай дысцыплінай і высакаякаснымі баявымі характарыстыкамі, кагортай аднадумцаў на чале з таленавітым арганізатарам А.Лісоўскім, які стаў для палякаў сімвалам няўлоўнасці і непераможнасці.

**Літаратура**


1. Еўмянькоў, В.І. Навіны "краёвыя" і замежныя ў польскамоўных выданнях другой паловы XVI – першай чвэрці XVII ст. "Меркурый ардынарыйны" (спроба апісання і верыфікацыі гістарычных крыніц) / В.І.Еўмянькоў. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2016. – 184 с.
2. Зорин, А.В. Лисовчики: Александр Юзеф Лисовский и его полк в истории Смутного времени / А.В.Зорин. – М.: Квадрига, 2017. – 236 с.
3. Dzieduszycki, M. Krótki rys dzijów i spraw lisowczycow / M. Dzieduszycki. – Lwów. – 1843. – T.1. – S. 123.
4. Ossendowski, F.A. Lisowczycy. Powieść historyczna / F.A.Ossendowski. – Wydawnictwo Polskie R. Wegnera, Poznań 1929. – 277 с.



**A.A. Gladkova**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: anngrin@mail.ru


**Reflection of the activities of Lisovsky's units in the novel by F.A. Ossendovsky "Lisowczycy"**


*Keywords: lisowcicy, "Moscow Troubles", Polish-Lithuanian Commonwealth, confederation, ethnic stereotype.*



*The article discusses the activities of Alexander Yuzef Lisovsky's units of during the time of "Moscow Troubles". Much attention is paid to the personality of Colonel Lisovsky, who received a kind of romantic artistic interpretation in the novel by F.A. Ossendovsky "Lisowczycy".*


Репозиторий ВГУ